# Замес каравая: вывучаем каляндарна-абрадавы рэпертуар беларусаў

**Л. Д. Лазюк,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі
Валішчанскай СШ Пінскага раёна

У працэсе інавацыйнай дзейнасці шмат увагі мы надавалі народным святам і абрадам, развучвалі калядныя, валачобныя, народныя песні, танцы, гульні, традыцыі нашай вёскі. Наладзілі цеснае ўзаемадзеянне з народным аўтэнтычным калектывам «Дударыхі» аграгарадка Валішча. Прапануем вашай увазе распрацоўку занятка аб’яднання па інтарэсах «Народная спадчына» на **тэму «Асаблівасці каляндарна-абрадавага рэпертуару. Абрад «Замес каравая»** для малодшых школьнікаў.

**Мэты:** далучэнне дзяцей да краязнаўчай і пошукава-даследчай дзейнасці; стымуляванне цікавасці да народных традыцый, звычаяў; вывучэнне гістарычнай і культурнай спадчыны сваёй Радзімы; выхаванне беражлівых адносін да прыроднай і культурнай спадчыны роднага краю.

## Ход заняткаў

### I. Арганізацыйна-матывацыйны этап

Арганізуецца абмеркаванне эпіграфу.

Каб зразумець сябе сапраўдным чалавекам, уявіць
прыналежнасць да свайго роднага, беларускага,
славянскага, зразумець свае месца ў сусвеце,
неабходна вывучаць народныя каштоўнасці, тое,
што стагоддзямі стваралі, выкарыстоўвалі захоўвалі
нашы продкі.
*І. В. Казакова*

### II. Асноўны этап

*Дзеці знаёмяцца з асаблівасцямі абраду і прымаюць у ім удзел.*

**Настаўнік.** Абрады беларусаў – сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў, якія сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды, паміж сабой, іх паводзіны ў жыццёва важных сітуацыях. Большасць беларускіх абрадаў мае старажытнае паходжанне і звязана з традыцыйнай ўсходнеславянскай культурай, гаспадарчай дзейнасцю (каляндарныя абрады), асабістым лёсам чалавека (сямейныя абрады).

Сёння мы пазнаёмімся з абрадам замесу каравая, які беражліва захоўваюць у аграгарадку Валішча.

Беларускія народныя вясельныя традыцыі – аснова культуры. Яны быццам масты звязваюць пакаленні. Час аставіў самае знакамітае і важнае,

тое, без якога дальнейшае жыццё маладой сям’і не прадстаўлялася магчымым. Сёння гэтая традыцыя стала сапраўдным дзівоцтвам. Дзясяткі гадоў назад яна займала асноўнае месца ў падрыхтоўцы да вясковага вяселля.

***Правядзенне абраду***

Каравай – не проста прыгожа выпечаны хлеб, гэта сімвал дабрабыту ў маладой сям’і. Яго пякуць у доме жаніха і нявесты. Бацькі маладых у яго прыгатаванні ніколі не ўдзельнічалі. Рабілі гэта каравайніцы – галоўнай сярод якіх была хросная маці.



Яны прыносілі прадукты для прыгатавання вясельнага каравая, бралі дзяжу, хросная маці замешвала каравай. Перад тым як замешваць каравай, прасілі ў Бога благаславення.



У каравайніцы ішлі абавязкова добрыя гаспадыні са шчаслівай жаночай доляй. Бо ад таго, як замешана і выпечана здоба, залежала сямейнае шчасце маладой сям’і.

На кожным этапе прыгатавання каравая спяваліся песні.

Пачатак замесу каравая суправаджаўся старадаўняй песняй.

Ходыла к Дунаю –
Там мэсце знаю,
Дэ воду браты,
Коровай рошчыняты.





Калі прадукты былі паложаны ў дзяжу, жанчыны браліся за лыжку, мяшалі цеста і спявалі песню.

Ой, вэчор, вэчор,
Коровай нэ пэчон.
А ў нашой Олечкі,
Да розумна матэнка.

Ой, як розвэрнэцца ,
Коровай спэчэцца.

Хросная маці мясіла каравай, а жанчыны спявалі песні.

Да мэсетэ доўго,
Да мэсетэ добрэ.
Коровай шоб подрос,
Шчасця молодым прынёс.

Коровай гібалі,
Молодым долі жэлалі.
А ў бога просілі,
Шоб дэток народылі.

Маці маладой павінна была глядзець за печчу, каб яна была добра напалена. Каравай у печ саджалі толькі пасля таго, як насыплюць у яе солі. Калі соль трашчыць, значыць можна выпякаць каравай.



Перад тым як саджаць каравай у печ, жанчыны спявалі песню.



Ходыла ў капусту,
Лісце ломаты.
Ёго положым мы на лопату.
Положым лісце мы на лопату,
Коровай будэм у пэч саджаты.

На драўляную лапату лажылі ліст капусты, а на капусту – добра вымяшаны каравай.



У абрадзе ўсё сімвалічна, як і ў самой вясельнай выпечцы. Круглая форма каравая ўвасабляе сонца. А калі, напрыклад, у вёсцы выходзіла замуж дзяўчына, плялі з цеста касу. Галубы пазначалі жаніха і нявесту.

Гатовы каравай змазвалі яйкам, благаслаўлялі і саджалі ў печ. Маці маладой прыносіла ваду, налівала ў драўляныя начоўкі, каб каравайніцы памылі рукі. Перад тым як мыць рукі, каравайніцы спявалі песню:



Коровайнычкі, мыйтэ ручкі,
Да на вішэнькі летэ.
Коб вішэнька да родылаcа,
Нашы деты любіліса.

Воду выносілі на вуліцу і вылівалі пад вішаньку. Далей каравайніцы хацелі платы за выпечку каравая. Гэта суправаджалася песняй.



Трэба вам сором
Хоть крохі маты.
Нам за роботу
Гарэлкі даты.

Маці нявесты запрашала каравайніц за стол такімі словамі: «Коровайнычкі, да за стол садетэса, шо нам Бог послаў, тым і жывэтэса».

Пачыналі і заканчвалі замес каравая песнямі і падзякамі.

Адзін са старажытных абрадаў заўсёды ў вёсцы праходзіў шчодра і весела. Мабыць, не здарма «свадьбу» на беларускай мове называюць вяселлем. Можа, менавіта, у гэтым прадуманым палескім абрадзе замесу каравая і схаваны «ключы» ад сямейнага шчасця.

**III. Заключны этап**

Дзеці выказваюць свае эмоцыі пасля ўдзелу ў мерапрыемстве.